✓**21 чэрвеня** ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася **выстаўка Гаўрыіла Вашчанкі «Зямля пад белымі крыламі»**, прысвечаная памяці і 90-годдзю з дня нараджэння мастака.

Г. Вашчанка (20 чэрвеня 1928 г., в. Чыкалавічы Брагінскага раёна – 14 лютага 2014 г.) – народны мастак Беларусі (1988), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1977), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1987). У 1955 г. скончыў Львоўскі інстытут прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва. З 1961 г. працаваў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, з 1975 г. – загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Творы майстра вылучаюцца жанравай і тэматычнай разнастайнасцю, роздумам аб праблемах часу і мінуўшчыне роднай зямлі. Асабліва дарагім і блізкім было для мастака ўсё, што звязанае з Палессем – месцам, дзе нарадзіўся і прайшло маленства. Палессе – гэта ягонае разуменне радзімы.

Выстаўка будзе працаваць да 5 верасня.